# ДЗЕЯЧЫ НАВУКІ І КУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСІ: АЛЯКСАНДР ІВАНАВІЧ СМОЛІК



24 кастрычніка 2024 г. споўнілася 80 гадоў доктару культуралогіі, прафесару Аляксандру Іванавічу Смоліку.

Прафесійнае станаўленне Аляксандра Іванавіча ажыццяўлялася ў непарыўнай сувязі з Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэтам.

У 1968 г. А. І. Смолік скончыў гістарычны факультэт Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя М. Горкага. Падчас вучобы быў камсоргам факультэта, а ў 1969 г. абраны сакратаром камітэта камсамола з правамі райкама інстытута. У 1972 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю па гістарычных навуках і праз год пачаў навукова-педагагічную працу ў МДПІ: прайшоў шлях ад асістэнта, старшага выкладчыка да дацэнта кафедры, загадчыка падрыхтоўчага аддзялення. З 1989 па 1992 г. быў дэканам факультэта падрыхтоўкі да паступлення ва ўстановы вышэйшай адукацыі і прафесійнай арыентацыі моладзі.

Больш за дваццаць гадоў Аляксандр Іванавіч з'яўляецца членам рэдакцыйнай калегіі навукова-метадычнага часопіса «Весці БДПУ. Серыя 2. Гісторыя. Філасофія. Паліталогія. Сацыялогія. Эканоміка. Культуралогія».

Пачынаючы з 1992 г. працоўная дзейнасць А. І. Смоліка звязана з Беларускім дзяржаўным універсітэтам культуры і мастацтваў. Дванаццаць гадоў да 2004 г. Аляксандр Іванавіч працаваў прарэктарам па вучэбнай рабоце, а з 2004 па 2006 г. – першым прарэктарам БДУКМ.

У 1999 г. А. І. Смолік абараніў доктарскую дысертацыю, першую ў Беларусі па тэорыі і гісторыі культуры, на тэму «Дзейнасць сацыяльна-культурных інстытутаў Беларусі ў посткатастрофным соцыуме», прысвечаную асаблівасцям развіцця трансфармацыйных працэсаў у грамадстве пасля чарнобыльскай трагедыі – буйнейшай тэхнагеннай катастрофы ў гісторыі чалавецтва, якая шмат у чым паўплывала на лёс краіны і грамадства. Вынікам навукова-даследчай дзейнасці з'явілася аўтарская канцэпцыя рэабілітацыі асобы посткатастрофнага соцыуму сродкамі мастацкай творчасці, якая паспяхова выкарыстоўваецца ўстановамі культуры нашай краіны.

Дзякуючы навуковаму аўтарытэту Аляксандра Іванавіча, пры БДУКМ адкрыты савет па абароне доктарскіх і кандыдацкіх дысертацый па спецыяльнасці 24.00.01 «Тэорыя і гісторыя культуры», старшынёй якога ён быў на працягу шэрагу гадоў. А. І. Смолік з'яўляўся членам экспертнага савета ВАК Рэспублікі Беларусь па тэорыі і гісторыі культуры, па тэорыі і гісторыі мастацтва; членам савета па абароне доктарскіх і кандыдацкіх дысертацый па спецыяльнасці «Тэорыя і гісторыя культуры» Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы і па спецыяльнасці «Журналістыка» Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

З 2006 г. А. І. Смолік узначаліў кафедру гісторыі Беларусі і музеязнаўства, а з 2009 г. – кафедру культуралогіі, якая стала вядучым цэнтрам культуралагічнай адукацыі ў Беларусі.

На базе кафедры пад кіраўніцтвам Аляксандра Іванавіча сфарміравана класічная навуковая школа ў галіне культуралогіі «Тэорыя і гісторыя культуры». Вынікі навуковых даследаванняў укараняюцца ў навучальны працэс і практыку як устаноў вышэйшай адукацыі, так і ўстаноў культуры і мастацтваў. Атрыманыя вынікі прайшлі апрабацыю ў ходзе арганізацыі навучальнага працэсу ва УВА рэспублікі па прадметах «Тэорыя і гісторыя культуры», «Сацыялогія культуры», «Філасофія культуры», «Анталогія культуры», «Рэгіянальныя культуры Беларусі», «Фенаменалогія культуры», «Масавая культура», «Міжкультурныя камунікацыі», «Рэлігія і культура», «Культурная антрапалогія», «Гісторыя беларускай культуралагічнай думкі», «Мультыкультуралізм як стратэгія ўзаемадзеяння этнакультурных груп», «Семіётыка культуры» і інш.

Навукова-даследчая дзейнасць кафедры накіравана на вывучэнне гісторыі і тэорыі айчыннай і сусветнай культуры, іх сацыядынамікі і функцыянавання ва ўмовах глабальнай інфармацыйна-камунікацыйнай прасторы; выяўленне існуючых у сучасным беларускім грамадстве форм і спосабаў стварэння, асваення, захавання і трансляцыі культуры; даследаванне ступені засваення культуры рознымі сацыяльна-дэмаграфічнымі, сацыяльна-этнічнымі, этнаканфесійнымі, прафесійнымі супольнасцямі, месца і ролі розных субкультур.

З 2021 г. члены прафесарска-выкладчыцкага складу кафедры пад кіраўніцтвам Аляксандра Іванавіча выконваюць планавую навукова-даследчую тэму «Нематэрыяльная культурная спадчына Беларусі ў сучасным тэзаўрусе культуры».

У сувязі з павелічэннем узаемнага беларуска-кітайскага супрацоўніцтва ў сферы адукацыі ўвага надаецца вывучэнню кітайскай культуры, спецыфікі яе генезісу, духоўным традыцыям і сучаснаму культурна-гістарычнаму працэсу.

Па ініцыятыве А. І. Смоліка ў верасні 2021 г. у Рэспубліканскім інстытуце кітаязнаўства імя Канфуцыя БДУ адбылося адкрыццё філіяла кафедры культуралогіі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, а ў 2023 г. ажыццёўлены набор студэнтаў па новай прафілізацыі – «сіналогія».

Сіналогія – гэта ўнікальны напрамак даследаванняў кітайскай культуры ў беларускай гуманітарыстыцы. У працэсе навучання студэнты сістэмна вывучаюць матэрыяльную і духоўную культуру Кітая, мову, традыцыі, тэорыю і гісторыю, культурную палітыку, філасофію, літаратуру, міфалогію, рэлігію, семіётыку і інш.

Стварэнне філіяла кафедры культуралогіі на базе Рэспубліканскага інстытута кітаязнаўства імя Канфуцыя БДУ абумоўлена актуальнасцю арганізацыі больш глыбокага і ўсебаковага адукацыйнага працэсу і вывучэння матэрыяльнай і духоўнай культуры Кітая, павышэння ўзроўню і якасці навукова-метадычнага забеспячэння кітаязнаўчых лекцыйных, семінарскіх і практычных заняткаў, дыпломных і магістарскіх работ, а таксама фарміравання ў студэнтаў і магістрантаў неабходных для кітаязнаўцы прафесійных якасцей і распаўсюджвання сучасных навуковых сацыякультурных і іншых спецыяльных ведаў аб гэтай краіне.

Пры кафедры функцыянуе магістратура, аспірантура і дактарантура па спецыяльнасці 24 00 01 «Тэорыя і гісторыя культуры». З 2019 г. – магістратура па спецыяльнасці «Культуралогія» на англійскай мове для замежных грамадзян.

Шматлікія навуковыя планы А. І. Смоліка, адукацыйныя стратэгіі і праекты адрозніваюць светапоглядная маштабнасць, змястоўная глыбіня і прагнастычная дальнабачнасць.

А. І. Смолік знаходзіўся ля вытокаў айчыннай культуралагічнай адукацыі, непасрэдна ўдзельнічаў у распрацоўцы адукацыйных стандартаў, вучэбных планаў і праграм для студэнтаў, магістрантаў і аспірантаў па культуралагічных спецыяльнасцях і спецыялізацыях. Ім распрацаваны і выдадзены інавацыйныя вучэбныя дапаможнікі: «Культуралогія: тэорыя культуры» (2008; у сааўтарстве з Л. К. Кухто), «Культуралогія: гісторыя культуры» (2009; у сааўтарстве з Л. К. Кухто, А. А. Цобкала), «Гісторыя беларускай культуралагічнай думкі» (2014; у сааўтарстве з Л. К. Кухто), «Субкультурные молодежные формирования XXI века» (2022; у сааўтарстве з В. Л. Гуцько, Л. К. Кухто), сярод нядаўніх – «Культуралогія» (2024; у сааўтарстве з Хуан Ічэнам і І. У. Субач) на трох мовах: беларускай, рускай і кітайскай. Навукова-педагагічныя працы Аляксандра Іванавіча – крыніцы ў вучэбнай і даследчай дзейнасці беларускіх, а сёння і кітайскіх, культуролагаў.

Аляксандр Іванавіч Смолік – асоба надзвычайнай працаздольнасці і ўнутранай дысцыпліны. І сёння прафесар сустракае свой юбілей ва аўдыторыіі. Ён вядзе заняткі па курсах «Культуралогія», «Тэорыя і гісторыя культуры», «Тэорыя культуры», «Гісторыя культуры», «Міфалогія Кітая і Беларусі: агульнае і спецыфічнае», «Станаўленне і развіццё беларускай культуралогіі як навукі і вучэбнай дысцыпліны», перадае свае грунтоўныя фундаментальныя веды і навуковы вопыт маладому пакаленню. Распрацаваныя ім аўтарскія курсы актуальныя і запатрабаваны як адукацыйны і выхаваўчы рэсурс абуджэння цікавасці ў моладзі да вывучэння і захавання гісторыка-культурнай спадчыны краіны.

А. І. Смолік вядомы ў краіне і па-за яе межамі, мае навуковы аўтарытэт у галіне тэорыі і гісторыі беларускай культуры. Яго фундаментальныя працы – манаграфіі «Сацыядынаміка культуры ў посткатастрофным соцыуме» (1999); «Гісторыя і культура беларускіх татар» (2000; у сааўтарстве з І. Б. Канапацкім); «Прыкладная культуралогія» (2005; у сааўтарстве з Я. Д. Грыгаровіч); «Божы дар Івана Кандрацьева» (2013); «Беларуская культуралогія: гісторыя і сучаснасць» (2014; у сааўтарстве з Л. К. Кухто); «Культура как образование: теоретико-прикладной анализ» (2015; у сааўтарстве з Ю. П. Бондарам); «Художественная культура Беларуси XVIII – 1-й четверти XX в.» (2019; у сааўтарстве з М. М. Сакалоўскай) – з'яўляюцца прыкладам глыбокага, мудрага падыходу ў даследаванні самых складаных пытанняў гістарычнага і сучаснага сацыякультурнага развіцця, дакладных, вычарпальных суджэнняў.

Па ініцыятыве А. І. Смоліка ў 2008 г. заснаваны Тышкевіцкія чытанні. Канферэнцыі, што праходзілі ў Мінску (2008), Лагойску (2009), Вілейцы (2010), Валожыне (2012, 2022), Свіслачы (2016), Барысаве (2018), Ружанах (2021), Мядзелі (2024), выйшлі і на міжнародны ўзровень: у 2014 г. чытанні арганізаваны ў Палацы Тышкевічаў у Крэцінзе (Літва).

Зборнікі матэрыялаў па выніках чытанняў друкуюцца ў серыі «Культурны імідж Беларусі». Заснаваная Аляксандрам Іванавічам гэтая серыя абагульняе працы па праблемах гуманітарнай адукацыі, у тым ліку культуралогіі, разгортванню культуры Беларусі ў часе і прасторы, дзейнасці беларускіх мысліцеляў мінулых стагоддзяў і інш.

У БДУКМ па прапанове Аляксандра Іванавіча створана мемарыяльная аўдыторыя ў гонар Канстанціна і Яўстаха Тышкевічаў – заснавальнікаў беларускага музеязнаўства і археалогіі.

А. І. Смолік з'яўляецца старшынёй навуковага савета навукова-метадычнага часопіса «Веснік Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў», намеснікам старшыні савета па абароне дысертацый Д 09 03 01 пры Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў. У савеце адбылася абарона трох доктарскіх і больш за 50 кандыдацкіх дысертацый (пад непасрэдным навуковым кіраўніцтвам А. І. Смоліка – 16 кандыдацкіх дысертацый) па культуралогіі, у тым ліку кітайскіх аспірантаў.

Юбілей Аляксандра Іванавіча адзначаецца ў Год якасці, што глыбока сімвалічна. Як навуковы кіраўнік, А. І. Смолік захоўвае і прымнажае традыцыі якасці ў падрыхтоўцы высокапрафесійных спецыялістаў. Ён нязменна быў і застаецца для студэнтаў, магістрантаў і аспірантаў, што пачынаюць свой шлях у навуцы, а таксама для калег прыкладам працавітасці і самадысцыпліны, сумленнасці і адказнасці, адданасці краіне і сваёй справе, павагі да людзей, жыццястойкасці. Для маладога пакалення Аляксандр Іванавіч з'яўляецца настаўнікам, які шчодра дзеліцца ведамі, ідэямі, прафесійным вопытам, каму вераць і за якім гатовы ісці яго вучні і паслядоўнікі.

*кандыдат культуралогіі, дацэнт, начальнік рэдакцыйнага аддзела БДУКМ*
**В. М. Сакалова**

**Рэктарат БДПУ, рэдакцыйная калегія і рэдакцыя часопіса «Весці БДПУ» віншуюць Аляксандра Іванавіча з юбілеем і жадаюць далейшых творчых поспехаў у прафесійнай і грамадскай дзейнасці на карысць нашай краіны!**